№ 149 (1213)

Серада, 15 жніўня 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 100 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

Надвор'е

Сёння ўдзень па краіне чакаецца пераменная воблачнасць, на поўначы кароткачасовыя дажджы. Вецер заходні і паўднёва-заходні, 3—8 м/с. Тэмпература паветра ўначы — +8...+13, удзень — +21...+26.

Пагадненне

Аб узаемных абавязацельствах адзінага кандыдата і шырокай грамадзянскай кааліцыі падчас і пасля выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Шырокая грамадзянская кааліцыя, у якую ўвайшлі паўнамоцныя прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў — з аднаго боку, і прэтэндэнты ў кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, адзіны кандыдат ад шырокай грамадзянскай кааліцыі Ганчарык Уладзімір Іванавіч і Домаш Сямён Мікалаевіч — з другога боку, усведамляючы адказнасць за лёс Рэспублікі Беларусь і неабходнасць вяртання краіны на шлях дэмакратычнага развіцця, заключылі пагадненне аб наступным:

1. Прэтэндэнты ў кандыдаты на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь У.І.Ганчарык і С.М.Домаш заканчваюць аб'яднанне выбарчых штабоў і структур у выбарчым штабе адзінага кандыдата ад шырокай грамадзянскай кааліцыі. Аб'яднаны выбарчы штаб здзяйсняе ўсё неабходнае для рэгістрацыі іх у якасці кандыдатаў на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

2. Пасля рэгістрацыі У.І.Ганчарыка кандыдатам на пасаду Прэзідэнта С.М.Домаш здымае сваю кандыдатуру на карысць У.І.Ганчарыка згодна з дасягнутымі раней дамоўленасцямі.

3. Пасля рэгістрацыі У.І.Ганчарыка кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь С.М.Домаш узначальвае Палітычны Савет штаба адзінага кандыдата.

4. У выпадку рэгістрацыі толькі аднаго з прэтэндэнтаў у кандыдаты ўсе ўдзельнікі гэтага пагаднення аказваюць яму ўсю магчымую падтрымку як адзінаму кандыдату ад шырокай грамадзянскай кааліцыі.

5. У выпадку стварэння дзеючым рэжымам перашкод для рэгістрацыі У.І.Ганчарыка кандыдатам на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яднаны штаб і абодва прэтэндэнты ў кандыдаты дзейнічаюць узгоднена і прымаюць усе законныя меры для забеспячэння рэгістрацыі, у тым ліку, калі спатрэбіцца, — зварот у міжнародныя арганізацыі і правядзенне масавых акцый пратэсту.

6. Адзіны кандыдат ад шырокай грамадзянскай кааліцыі абяцае ў выпадку абрання на пасаду Прэзідэнта разам з іншым прэтэндэнтам у кандыдаты, які здаў у Цэнтрвыбаркам неабходную для рэгістрацыі колькасць подпісаў, сфарміраваць урад на чале з ім, а таксама ў кароткі тэрмін перадаць частку прэзідэнцкіх паўнамоцтваў (у межах агульнага працэсу падзелу ўладаў) ураду.

7. Адзіны кандыдат ад шырокай грамадзянскай кааліцыі ў выпадку перамогі на прэзідэнцкіх выбарах абяцае правесці дэмакратычныя парламенцкія выбары і прапанаваць на зацвярджэнне зноў абранаму парламенту тую ж самую кандыдатуру на пасаду прэм'ер-міністра.

8. У галіне дзяржаўнага будаўніцтва адзіны кандыдат бярэ на сябе абавязак:

* Гарантаваць аднаўленне дэмакратычнай сістэмы ўлады ў краіне, заснаванай на прынцыпах падзелу ўладаў, вяршэнства закону і парламентарызму; абмежаванне паўнамоцтваў прэзідэнта; аднаўленне функцый парламента; пашырэнне паўнамоцтваў урада і органаў мясцовага самакіравання; незалежнасць судовай улады і свабоду СМІ, у тым ліку — стварэнне грамадскага тэлевізійнага канала.

* Забяспечыць абранне парламента і мясцовых прадстаўнічых органаў улады па змешанай прапарцыянальна-мажарытарнай сістэме, а таксама зацвярджэнне ўрада парламентам, гарантаваць аднаўленне поўнага кантролю з боку парламента і органаў мясцовага самакіравання за бюджэтамі і іншымі дзяржаўнымі фондамі.

* Забяспечыць унясенне змен у выбарчае заканадаўства, гарантаванне фарміравання выбарчых камісій з удзелам палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, неўмяшальніцтва органаў улады ў іх дзейнасць.

* Узяць курс на забеспячэнне дынамічнага развіцця эканомікі, уздым жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

* Гарантаваць безумоўнае захаванне канстытуцыйных палажэнняў аб суверэнітэце, незалежнасці і імкненні да нейтралітэту. Ажыццяўляць эфектыўную шматвектарную знешнепалітычную дзейнасць, галоўным прынцыпам якой з'яўляецца ўзмацненне цесных узаемакарысных партнёрскіх адносін з Расіяй, Украінай і іншымі краінамі. Забяспечыць інтэграцыю Беларусі ў агульнаеўрапейскую палітычную, эканамічную і гуманітарную прастору. Стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця нацыянальнай культуры, мовы, традыцый і ўжывання нацыянальнай гістарычнай сімволікі беларускага народа.

9. Лідэры палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, грамадскія і палітычныя дзеячы, якія падпісалі гэта пагадненне, абавязваюцца мабілізаваць усе сілы для агульнай падтрымкі адзінага кандыдата з мэтай перамогі на маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах і правядзенне неабходных палітычных і эканамічных пераўтварэнняў пасля перамогі на выбарах.

Гэтае Пагадненне з'яўляецца адкрытым для далучэння іншых палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

Уладзімір ГАНЧАРЫК, адзіны кандыдат ад шырокай грамадзянскай кааліцыі.
Сямён ДОМАШ, прэтэндэнт у кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
Пагадненне падпісалі: С.КАЛЯКІН, П.КАЗЛОЎСКІ, М.ЧЫГІР, М.МАРЫНІЧ, А.ЯРАШУК.
Ад палітычных партый пагадненне падпісалі: В.ВЯЧОРКА, А.ЛЯБЕДЗЬКА, С.ШУШКЕВІЧ, М.СТАТКЕВІЧ, В.ПАЛЕВІКОВА, А.БУХВОСТАЎ, А.ГРАМЫКА, М.ФРЫДЛЯНД.
Ад грамадскіх аб'яднанняў: В.ЛЯВОНАЎ ("За новую Беларусь"), А.МІЛІНКЕВІЧ ("Рэгіянальная Беларусь"), А.САННІКАЎ ("Хартыя-97").

ВЫБАР-2001

Уладзімір Ганчарык — адзіны кандыдат

Сямён Домаш пасля перамогі зойме пасаду прэм'ер-міністра

У панядзелак, 13 жніўня, у сталічным Доме ветэранаў адбылося ўрачыстае падпісанне пагаднення паміж адзіным кандыдатам ад шырокай грамадзянскай кааліцыі Уладзімірам Ганчарыкам і членамі "пяцёркі", да якіх далучыліся Міхаіл Марыніч і Аляксандр Ярашук, а таксама з шырокім колам палітычных і грамадскіх арганізацый Беларусі.

Трэба прызнаць — прыйшлося пахваляваціса ў панядзелак не толькі падпісантам пагаднення, але і шматлікім журналістам і прадстаўнікам грамадскасці, якія сабраліся на ўрачыстую цырымонію: папулярная беларуская тэлевядучая Зінаіда Бандарэнка выйшла на сцэну з тэкстам пагаднення не ў прызначаныя 3 гадзіны апоўдні, а роўна на дзве гадзіны пазней. Але ж, трэба прызнаць, нягледзячы на затрымку, Падзея з вялікай літары атрымалася: сведкі і ўдзельнікі пагаднення некалькі разоў падымаліся са сваіх месцаў, каб апладысментамі падтрымаць "свята яднання дэмакратычных арганізацый і сілаў Беларусі".



Будучыя прэзідэнт і прэм'ер?

Фота IREX/ProMedia.

Пагадненне, тэкст якога мы друкуем цалкам, уключае пералік узаемных абавязацельстваў падчас і пасля заканчэння прэзідэнцкіх выбараў.

Мяркуецца, што адразу пасля рэгістрацыі Уладзіміра Ганчарыка кандыдатам у прэзідэнты, Сямён Домаш здыме сваю кандыдатуру на карысць адзінага кандыдата. Аднак як паведаміў журналістам сам Домаш, дакладная дата яго "здыму" будзе паведамлена крыху пазней, і згодна з пагадненнямі, "яму гарантуецца месца кіраўніка палітычнага савета штаба адзінага кандыдата, а ў выпадку перамогі У.Ганчарыка — пасада прэм'ер-міністра".

Калі адзіны кандыдат па нейкіх штучных прычынах будзе зняты з прэзідэнцкай гонкі, усімі дэмакратычнымі сіламі Беларусі, як сказана ў Пагадненні, будуць прыняты ўсе магчымыя крокі — аж да масавых акцый пратэсту і звяртання да міжнароднай супольнасці — да таго, каб ён прыняў-такі ўдзел у выбарах.

Домаш і Ганчарык таксама падпісалі ўзаемныя пагадненні з 83 маладзёжнымі арганізацыямі, якія ў сваю чаргу паабяцалі прыкладаць усе сілы для папулярызацыі і "раскруткі" адзінага кандыдата ў астатні да выбараў час у маладзёжным асяроддзі.

Уладзімір Ганчарык таксама падзякаваў Сямёну Домашу за яго мужны крок, які даўся апошняму нялёгка, але, як адзначыў сам Домаш, для яго "галоўнае — перамога дэмакратычных сіл на гэтых выбарах".

Сямён Домаш: *"Мы павінны пабудаваць на Беларусі дэмакратычную дзяржаву, мы павінны пабудаваць дзяржаву, якую будуць паважаць ва ўсім свеце. Нам бы хацелася, каб наш беларускі народ зразумеў, што пабудаваць такую дзяржаву мы можам толькі разам".*

Уладзімір Ганчарык: *"Сёння мы зрабілі крок, наступны крок да перамогі — да пачатку будавання новай, дэмакратычнай Беларусі. І калі мы разам — нам будзе лягчэй дамагчыся гэтай перамогі".*

Напрыканцы хацелася б пажадаць нашым паважаным дэмакратам адну "дробязь" — перакласці нарэшце на беларускую мову папярэдні слоган адзінага кандыдата "В единстве — сила". Я думаю, што гэта нескладана. Таму што ў панядзелак, нягледзячы на ўсе ўрачыстасці, рускамоўны тэкст лозунгу выглядаў яўным дысанансам на фоне цудоўнай беларускай мовы нашых аб'яднаўшыхся дэмакратаў. Нягледзячы на ярка ззяючае побач са слоганам сонейка...

Алесь СІЛІЧ.

БНФ высока ацэньвае падпісанне пагаднення

13 жніўня падпісана суботняя версія паразумення паміж двума асноўнымі прэтэндэнтамі — Уладзімірам Ганчарыкам і Сямёнам Домашам, а таксама вядучымі палітычнымі партыямі і грамадскімі аб'яднаннямі, рухамі, ініцыятывамі.

Адзіная змена ў параўнанні з суботнім тэкстам — гэта сцвярджэнне, што аб'ядноўваюцца не толькі штабы С.Домаша і Ул.Ганчарыка, але таксама штабы астатніх удзельнікаў пяцёркі і А.Ярашука, М.Марыніча.

"Мы высока ацэньваем сённяшняе пагадненне і тое, што была дасягнута прынцыповая згода паміж рознымі палітычнымі суб'ектамі. І хаця, напрыклад, Партыя камуністаў Беларускай падпісала сённяшняе пагадненне з агаворкай аб непрыняцці пункту 6, які датычыць прэм'ерства Сямёна Домаша. Я думаю, што гэта на фоне ўсеагульнага паразумення не так прынцыпова, — каменціруе старшыня Партыі БНФ **Вінцук Вячорка,** — а галоўнае пытанне, якое паўстае перад фронтам зараз: як эфектыўна арганізаваць працу нашых структур, якія павінны захоўваць сваю аўтаномію".

Прэс-служба БНФ "Адраджэньне" і Партыі БНФ.

ЧАТЫРЫ КАНДЫДАТЫ Ў ПРЭЗІДЭНТЫ

14 жніўня апоўдні Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала чатырох кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Імі сталі Уладзімір Ганчарык, Сяргей Гайдукевіч, Сямён Домаш і Аляксандр Лукашэнка.





МОЛАДЗЬ ВЫБІРАЕ

13-гадовы падлетак быў збіты супрацоўнікам міліцыі

Чалавек у цывільным схапіў 13-гадовага Андрэя Янушэўскага, калі той клеіў "зуброўскую" наклейку. Мужчына схапіў яго за галаву і з размаху стукнуў хлопца аб дрэва, якое знаходзілася побач. У паўпрытомным стане Андрэй вырваўся і ўцёк. Толькі позна ўвечары ён вярнуўся дадому. Хлопец не памятае, дзе ён знаходзіўся ў гэты час.

Як стала вядома пазней, гэты мужчына — супрацоўнік барысаўскага АБЭЗа Алег Валяр'янавіч Каптур.

Міліцыянты ў Маладзечне ўжываюць катаванні

Двое актывістаў руху супраціўлення "Зубр" былі затрыманы ноччу ў Маладзечне за тое, што ляпілі наклейкі. Зміцер Міцкевіч ды Юрась Смятанка былі адвезены ў міліцэйскі пастарунак. У аддзяленні на хлопцаў аказваўся ціск. Міліцыянт, чыё імя невядома, ціснуў хлопцам на шыі, каб тыя распавялі, хто ім даў наклейкі. Аднак не дачакаўшыся "праўды", міліцыянты выклікалі бацькоў хлопцаў, пасля чаго тыя былі адпушчаны дахаты.

"Зубры" абмянялі кнігі пра Леніна на кнігі па беларускай гісторыі

У віцебскім скверы ля плошчы Леніна моладзь з руху супраціўлення "Зубр" распачала новую акцыю.

Кнігі часоў развітога сацыялізму, якія страцілі маладога чытача, абменьваліся на беларускія выданні па гісторыі краіны, нацыянальным мастацтве і на творы вялікага земляка Уладзіміра Караткевіча, ды аўдыёкасеты.

Гэтая акцыя, як заяўляюць "зубры", стане прэлюдыяй да абмену, што адбудзецца 9-га верасня. У гэты дзень моладзь збіраецца змяніць старога прэзідэнта на новага.

Бессилие рождает насилие

Заявление Объединенной гражданской партии

В последнее время силовые структуры и пропагандистская машина режима ведут целенаправленную кампанию по запугиванию и дискредитации Объединенной гражданской партии и ее членов.

Разгромлен офис в Кричеве. За инициативу создания региональной КРДС возбуждено судебное дело в отношении руководителя Солигорской организации ОГП Ларисы Насанович. Совершено нападение людей в милицейской форме на помещение, где находился штаб мобилизационной кампании молодежи ОГП и других молодежных организаций. Подверглись физическому насилию и психологическому давлению активисты партии в Солигорске, Кричеве, Минске, Гродно, Дзержинске, Витебске и ряде других городов. На телеэкране и в радиоэфире идут специальные программы, направленные на дискредитацию ОГП и ее лидеров. 8 августа в Гомеле правоохранительные органы без санкции прокурора предприняли попытку проникнуть в помещение офиса ОГП. Был задержан руководитель Гомельской организации ОГП Владимир Кацоро, в отношении которого был составлен протокол за "создание препятствий действиям милиции". Какое-то время продолжалась осада здания.

ОГП оценивает начавшуюся зачистку как спланированную акцию, как реакцию властей на инициированную партией общенациональную кампанию "Хотим знать правду". Это попытка заставить замолчать тех, кто открыто требует ответа на вопросы.

ГДЕ Гончар? ГДЕ Захаренко? ГДЕ Красовский? ГДЕ Завадский? ЧТО произошло с Карпенко? ПОЧЕМУ в тюрьме Климов и Щукин?

Бессилие рождает насилие, слабость провоцирует репрессии, страх — обильное выделение адреналина. Совершенно очевидно, что душевнобольная власть нуждается в постельном режиме. Государственные люди, будьте бдительны! Вас превращают в орудие правонарушений и преступлений. Зачем вам это?

ОГП призывает местные органы власти, правоохранительные органы не проявлять избыточное усердие при выполнении приказов и решений, противоречащих Конституции и здравому смыслу. Думайте! Это совсем не больно. Хамство, ложь и насилие не бесконечны. Когда-то это все равно заканчивается. И, возможно, уже 9 сентября.

ТРЫВОЖНЫ РОЗДУМ

Праз два тыдні пачнецца вайна?

На жаль, гэта не жарт. Як вядома, Лукашэнка і яго атачэнне запланавалі на канец жніўня самыя буйныя за апошняе дзесяцігоддзе ваенныя вучэнні "Нёман-2001" на мяжы з Літвой. Захад не прымусіў сябе доўга чакаць і аб'явіў аб правядзенні ў гэты ж самы час у Літве самых маштабных у Прыбалтыцы за апошнія гады міжнародных вучэнняў з удзелам вайскоўцаў ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі. Такім чынам, побач распачынаюць свае ваенныя гульні дзве буйнейшыя ваенныя групоўкі.

Мы ведаем, што нават мітынгі і шэсці камуністаў і дэмакратаў улады многіх краін разводзяць у часе і прасторы. Яны імкнуцца, каб тыя ладзілі свае мерапрыемствы ў розных месцах горада, каб іх шляхі не перакрыжоўваліся, інакш сутыкненняў не пазбегнуць. А тут сыходзяцца нос у нос буйныя ваенныя групоўкі. Уяўляеце, нейкі наш артылерыст дапусціць памылку і снарад заляціць на тэрыторыю Літвы. Альбо лётчык нечакана парушыць паветраную мяжу краіны-суседкі. І тады... І тады можна будзе атрымаць моцны ўдар у адказ. Так што спакойна спаць мы ніяк не можам.

Дык навошта Лукашэнка задумаў тыя вучэнні? Тым болей, у жніўні. Вядома ж, што такія вучэнні звычайна праводзяцца глыбокай восенню, калі ўжо ўбраны ўраджай з палёў. Навошта ж гусеніцамі танкаў пляжыць бульбу і цукровыя буракі на палях (а без гэтага, нават калі ўсё прадугледзець, не абыдзецца)? Былы міністр абароны, генерал-палкоўнік Павел Казлоўскі ў папярэднім нумары нашай газеты называе гэтыя вучэнні палітычнай акцыяй. Так яно і ёсць, бо яны праводзяцца напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў.

Лукашэнка адчувае, што выбары ён прайграе, таму, відаць, і рыхтуецца сілай утрымаць уладу. Ён ужо заяўляў, што будзе абапірацца на ўнутраныя войскі і спецыяльны атрад хуткага рэагавання пад камандаваннем сумнавядомага Паўлічэнкі дзеля захавання сваёй улады. Але яго непакояць заходнееўрапейскія краіны, якія могуць запатрабаваць падпарадкавацца волі народа і прызнаць вынікі выбараў, а не фальсіфікаваць іх. І таму ён вырашыў, напэўна, папужаць іх. Маўляў, Беларусь — не Югаславія, у яе моцная армія. Вучэнні "Нёман-2001" — гэта дэманстрацыя мускулаў. Ды Захад не спужаўся, аб'явіў свае вучэнні. І гэта яго моцны ход. Вядома, што Лукашэнка пасля адхілення ад улады Мілошавіча стаў адзіным бяльмом у Еўропе, ракавай пухлінай на яе целе. Не выключана, што НАТО чакае толькі нагоды, каб вылечыць кантынент ад паганай хваробы. А тут такі падарунак — пагрозлівыя вучэнні з боку Лукашэнкі.

Здзіўляе спакой нашых грамадзян. Чаму яны не мітынгуюць, не патрабуюць адмовы ад небяспечных ваенных гульняў? Чаму маўчаць партыі, патэнцыяльныя кандыдаты на прэзідэнцкую пасаду? Варта ўсім (пакуль не позна) узняць свой голас і патрабаваць адмены небяспечных ваенных гульняў.

Алесь ДРАБЧУК.

ПУЛЬС

Зімоўскага паклічуць у суд

Жыхар горада Барысава, член Аб'яднанай грамадзянскай партыі Валерый Кабак накіраваў скаргу ў праваабарончы цэнтр "Вясна", а таксама падаў іск у суд да Беларускага тэлебачання і вядучага праграмы "Рэзананс" Аляксандра Зімоўскага.

Напярэдадні такі ж іск быў пададзены ад АГП і яе лідэра Анатоля Лябедзькі. Нагадаем, што па Нацыянальным беларускім тэлеканале, у прыватнасці, у праграме Рэзананс" былі паказаны сюжэты пра тое, быццам бы адзін з актывістаў АГП з горада Барысава за плату ў 500 долараў ЗША абяцаў тром членам барысаўскага аддзялення гэтай партыі дапамогу ў атрыманні палітычнага прытулку ў адной з заходніх краін. Былі названы прозвішчы трох грамадзян: Міхаіла і Святланы Касабуцкіх, а таксама Валерыя Кабака.

У заяве, пададзенай у праваабарончы цэнтр "Вясна", Валерый Кабак піша: "Тое, што было сказана ў мой адрас па Беларускім тэлебачанні, нібыта партыя АГП абавязалася за 500 долараў дапамагчы ажыццявіць палітычную эміграцыю, — лічу паклёпам. Я не маю да гэтага ніякага дачынення".

Генадзь БАРБАРЫЧ.

Ізраіль не супраць прыезду А.Лукашэнкі ў гэтую краіну

"Мы не супраць турызму. Ізраіль рады вітаць турыстаў з усяго свету, і мы не хацелі б ставіць такія адносіны да турыстаў у залежнасць ад унутраных стасункаў паміж беларускімі палітыкамі", — заявіла Эці Кашір-Касласі, часовая паверанная ў справах Ізраіля ў Беларусі, адказваючы на пытанне журналістаў адносна перспектыў эміграцыі Аляксандра Лукашэнкі ў Дзяржаву Ізраіль.

Як вядома, дзеючы кіраўнік дзяржавы заявіў аб намеры "збегчы ў Ізраіль" 8 жніўня, падчас сустрэчы з прадстаўнікамі прэсы, адказваючы на пытанне журналісткі Ірыны Халіп аб сваіх планах на выпадак паражэння на маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах.

Юрый ШЫРОКІ.

Хацелі падтрымаць Шчукіна, а трапілі ў пастарунак

13 жніўня павінен быў адбыцца прабег у падтрымку Валерыя Шчукіна па маршруце Мінск—Жодзіна. Але, як вядома, абласны выканкам дазволу на яго не даў. Таму маладафронтаўцы накіраваліся ў Жодзіна цягніком.

У Жодзінскім СІЗА перадачу для В.Шчукіна, у якой былі харчы і прэса, не прынялі, маўляў, адну перадачу ў гэтым месяцы ён ужо атрымаў, а значыць, больш не мае права і можна перадаць толькі лекі.

За 50 метраў ад будынку СІЗА каля плоту з надпісам "Свабоду Шчукіну" маладафронтаўцы сфатаграфаваліся і, надзеўшы фірмовыя майкі "Выбірай!" ды наклеіўшы на іх паперкі са словамі "Выбірай свабоду", наладзілі пікет. Каля іх ездзілі байкеры з бел-чырвона-белымі сцягамі.

Неўзабаве падышлі міліцыянты з мэтай высвятлення асобаў прысутных. Былі затрыманы і адвезены ў мясцовы РАУС Лявон Ачапоўскі, Віталь Кошалеў, Дзяніс Мархаток, Аляксей Талстоў, Франц Корзун (ён — з маладзёжнага хрысціянскага саюза), Зміцер Чартком, Павел Красоўскі, Аляксей Уланаў, Віктар Барысаў, Зміцер Ляшчынскі, Яўген Мурашка.

У РАУСе міліцыянты склалі тлумачальную, пратрымалі адну гадзіну і ўсіх адпусцілі.

Антон КОРЗУН.

Людміла Карпенка і Ірына Красоўская выступілі ў Гродне

"Мая галоўная мэта — пры маім жыцці даведацца, хто выканаў загад забіць майго мужа, бо імя заказчыка мне вядома", — паведаміла на сустрэчы з прадстаўнікамі грамадскасці Гродна Людміла Карпенка, жонка вядомага беларускага палітыка Генадзя Карпенкі, які памёр пры нявысветленых абставінах.

Ірына Красоўская абвергла меркаванне, якое прагучала падчас сустрэчы ў Гродне, што да знікнення вядомых палітыкаў нібыта мае дачыненне беларуская апазіцыя. Паводле слоў Ірыны Красоўскай, "беларуская апазіцыя ніколі не была цынічнай, каб ажыццявіць такія злачынствы". Ірына Красоўская не лічыць свайго мужа загінуўшым. Яна адзначыла: "У мяне няма падстаў лічыць, што ён забіты. Пакуль я жыву, я буду спадзявацца, што ён таксама жывы". Прысутных на сустрэчы грамадзян цікавілі перспектывы расследавання "гучных" крымінальных спраў у Беларусі. Людміла Карпенка паведаміла, што яна вядзе самастойнае следства, аднак, на яе думку, пры сённяшняй уладзе людзі, якія шмат маглі б раскадаць, баяцца гаварыць.

Павел МАЖЭЙКА.

Народная Воля
15 ЖНІЎНЯ 2001 г.

ТЕМА НЕДЕЛИ

Кажется, эти слова А.Г.Лукашенко, сказанные им на недавней пресс-конференции, "Народная воля" уже приводила. Но повторим: "...все, о чем мы будем говорить, должно быть напечатано без искажения". Не отвечая за другие издания, наша газета следует просьбе Александра Григорьевича. Поскольку Белорусское телевидение, "Советская Белоруссия" и другие государственные издания представили диалог журналистов независимых газет с А.Лукашенко в урезанном виде, то мы продолжаем печатать отчет с пресс-конференции. В сегодняшнем номере — ответы на вопросы журналиста "Белорусской газеты" Ольги Тарасевич, ее комментарий и интервью, взятое у коллег.

ГОСУДАРСТВО И ПРЕССА: предвыборный всплеск нормальных отношений

Ольга ТАРАСЕВИЧ

Это был достаточно смелый жест со стороны Лукашенко — пригласить на пресс-конференцию журналистов негосударственных изданий. Вряд ли ему просто далось решение об организации этой встречи — с учетом его резко негативного отношения к любым проявлениям критики. Тем ценнее разговор с "открытым забралом".

Журналистам негосударственных изданий впервые представилась возможность задать любые интересующие их вопросы, а не играть роль статистов на фоне монологов Лукашенко, иллюстрирующих якобы царящий на просторах отечества разгул демократии. На этот раз все было честно. В кои-то веки Лукашенко вежливо (правда, не без иронии) уточнил: все ли темы, интересующие журналистов негосударственных СМИ, затронуты. Хотя, возможно, тональность вопросов была для главы государства нелицеприятной. Вряд ли с ним последние лет шесть кто-нибудь так разговаривал. Впрочем, не мы тому виной — до недавнего времени А.Г. отдавал предпочтение жанру монолога. А событий за это время в стране произошло немало. Как можно было спрашивать без эмоций о таких непонятных и трагичных событиях, как исчезновение людей?

Что же касается рассуждений отдельных представителей госСМИ о якобы проявленном "оппозиционными" журналистами хамстве, то они представляются безосновательными по ряду причин. "Каков вопрос — таков ответ" — этот принцип у Лукашенко срабатывал моментально. И, отвечая на резкие вопросы, он парировал, стремился мгновенно перевести разговор на другую тему — будь то особенности журналистов или риторический вопрос, цепляющий за собой рассуждения из совершенно другого контекста. У него неплохая реакция. Такого чтобы обидеть — надо постараться.

Что же касается настойчивости, с которой мы переспрашивали и уточняли интересующие нас моменты, то это на самом деле совершенно обыденный, как щелчок диктофона или стук компьютерной клавиатуры, момент. Если собеседник не отвечает на вопрос, то вопрос нужно уточнить. Хотя, может быть, некоторые считающие себя журналистами персоналии об этом уже успели позабыть. Может, когда тональность и темы статей задает какой-нибудь чиновник с поджатыми губками, а максимальный профессиональный напряг выглядит как звонок в пресс-службу администрации или правительства с последующим променадом с чиновниками — может быть, в этом случае все профессиональные журналистские рефлексы действительно атрофируются.

На пресс-конференции мы попытались выяснить точку зрения главы государства на наиболее актуальные темы. Президент Лукашенко тоже внакладе не остался — его инициатива стала самым ярким информационным поводом минувшей недели, он получил три полосы негосударственных газет для изложения своих взглядов и множества журналистских комментариев. Он сможет использовать встречу с журналистами негосударственных газет как свидетельство того, что он умеет разговаривать с политическими оппонентами. В канун предвыборной кампании заявление о том, что встречался я, дескать, с этими оппозиционерами, они меня обозвали невменяемым, а я же все стерпел, — будет выглядеть эффектно и наверняка понравится некоторой части электората.

Со стороны Лукашенко были сделаны заявления о том, что подобные встречи могут стать регулярными. Что ж, это было бы неплохо. Однако это одно из тех заявлений, которое сложно воспринимать всерьез, — слишком многое изменилось за последние семь лет. Уважение к оппонентам — это черта характера, который, будь ты хоть трижды моложе Гончарика, уже не изменится.

"Я НЕ ПРЕЗИДЕНТ"

Лукашенко готов уйти, если журналисты обнаружат ошибки в его декларациях о доходах

— Задавайте любые вопросы — про жену, любовниц, про ролики, — сказал Лукашенко. — Тем более все эти темы... Мне тут приходит на ум одно слово, но оно нелитературное. Поэтому скажем так, интеллигентно: все эти темы уже обсуждались. Спрашивайте, о чем угодно".

Свое желание встретиться с журналистами президент объяснил следующим образом: "Дело не только в том, что действительно были просьбы о моей встрече с журналистами ведущих средств массовой информации. Дело и в тех упреках, которые, как из рога изобилия, начали сыпаться в мой адрес. Мол, я не хочу встречаться с журналистами, и прежде всего с теми, что представляют оппозиционные средства массовой информации. Извините за нескромность, но я всегда считал своим достоинством то, что я никогда не боялся идти в любую аудиторию и к любым журналистам и искренне и честно отвечать на вопросы, которые передо мной были поставлены. Поэтому это тоже фактор не менее важный, который не то что бы меня толкает к тому, чтобы я встречался сегодня и впредь с журналистами. А заставляет меня этот фактор. Я его принимаю, этот упрек. И сегодня я встречаюсь с вами и по этой причине. И я готов строить с вами не только деловой, но и искренний разговор. Я думаю, что я имею право поставить перед вами одно условие: все, о чем мы будем говорить, должно быть напечатано без искажений. А уж какие вы выводы будете делать, как комментировать, как обыгрывать — это ваше дело. Ваше право, и тут я не могу настаивать. А вот на публикацию моих слов без искажений я имею право. Я прошу, чтобы так было и в частных средствах массовой информации, и в государственных.

...Я не рассчитываю, что получу от оппозиционных средств массовой информации какую-то поддержку — и я не для этого приглашал сюда представителей оппозиционных СМИ. Но тем не менее хотя бы у вас, в вашем сердце должно остаться чувство удовлетворения, что вы встретились с президентом и он ответил на ваши вопросы, и вы смогли задать любой вопрос. Для меня это очень важно".

— Почему вы так долго выдерживали паузу, почему вы не сразу начали комментировать обнародованные Владимиром Гончариком документы?

— Я не считаю, что я должен на любой визг оппозиции, на ее шантаж отвечать. И вы как журналисты должны знать, кто по закону, по Конституции занимается непосредственно этими вопросами. А что касается вашего Гончарика, то вы читали это письмо? Вот которое мне было направлено — вы его читали?

Ну вы, Ирина (обращается к заместителю главного редактора "БДГ" Ирине Халип), наверное, его читали. А я у Ольги спрашиваю. Она его не читала! Я могу вам дать почитать! Цель там одна — срезать всю силовую составляющую в нашем государстве, снять головы силовикам. Не дождется! Он этого не дождется. И еще — вы говорите о каких-то документах? Вы их видели — те документы, которые мне были направлены? Не видели. Я тоже могу вам их показать. И если уж вас это так волнует, вот лично вас (население, я знаю, как на это реагирует) — я могу вам и лично прокомментировать эти документы. Они не выдерживают никакой критики.

Но. Я никакой паузы не выдерживал. Вот вы меня в газетах упрекали: "Молчит". Молчит-молчит-молчит... Раз в более общем виде я сказал, потом более жестко, а вы закричали — а, вот там Лукашенко готовит государственный переворот. Молчал — было плохо. Сказал — еще хуже. Какой государственный переворот, если уж касаться этого вопроса? Я что, сам себя буду переворачивать? Нет, не у Лукашенко была истерика в связи с тем, что его якобы в Сочи не поддержал Путин. Да — я цитирую одну из оппозиционных газет: Лукашенко сделал 31 июля такое заявление на совещании с органами власти потому, что его в Сочи не поддержал Путин. Да будет вам! Сочи-то было после этого заявления. Вы даже уже настолько фальсифицируете эти факты, не просто тенденциозно истолковываете — вы их фальсифицируете. Почему я должен на это отвечать? Есть соответствующие органы власти, которые по закону, по Конституции этим занимаются.

И последнее — вот эти документы. Так называемые документы. Они же не вчера появились. Они существуют уже по меньшей мере полтора года. Чего же вы раньше не показывали их народу? А не надо было раньше! Вам надо это к случаю. А случай — политический. Выборы. К этому сегодня клеят все. И я еще вам хочу сказать: то, что вы уже знаете. То ли еще будет дальше.

У вас же в загашнике там, в ваших ящиках журналистских, скажем так образно, еще немало грязи. Немало. Но вся ситуация состоит в том, что в момент политический меня втягивают в эти разборки. А я что — должен в них втягиваться? Нет. И не буду этого делать. Но чтобы вы меня не упрекали, что я боюсь, — я иногда буду вас посвящать в ваши собственные тайны. В некоторые тайны ваших хозяев. Так, как это было 31 июля. И никакой там истерики — истерика там потом была в оппозиции.

И в третий раз хочу сказать: не собираюсь на каждый визг реагировать. Есть люди, которые очень четко на это реагируют. Ирина Халип этих людей очень хорошо знает и представляла им слово на страницах своей газеты. И они там очень подробно отвечали на некоторые вопросы. Наверное, они на это имеют право, хотя и не поддерживаю их позиции — что они начинают там оправдываться. Чего оправдываться? Там же ни один тезис не выдерживает критики, ни один... Я не хочу говорить об этом публично. Потому что это — попытки втянуть меня в эту конкретику. Даже не проблематику, а конкретику. Не получится. Шантажировать меня не получится. Для меня 3200 в прошлом году человек исчезнувших, их судьбы — все одинаковы. А то, что вами выдергиваются некоторые вещи, некоторые люди, — это ваше право. Наверное. Хотя я бы хотел, чтобы вы были более искренними и порядочными в этом отношении.

— Александр Григорьевич, вы часто говорили о том, что уверены в своей победе на президентских выборах. Тогда почему бы вам не включить в состав избирательных комиссий представителей оппозиции — пусть бы они убедились в честной победе?

— А почему вы не хотели включаться? Меня ваша неосведомленность, Ольга, вообще поражает. Или вы знаете истинное положение дел, но задаете наивный вопрос, или не знаете? Будем считать — не знаете...

Вот недавно шум стоял — нас, дескать, исключили. Шумели оппозиционеры, хотя они даже списки не подали. Если Либерально-демократическая партия хотела участвовать в этих комиссиях, то у них, по-моему, аж 700 или 800 человек в этих комиссиях. Кто мешал другим партиям, движениям и так далее участвовать в комиссиях?

Вот вы говорите — оппозиционным. А вы посмотрите официальные данные — сколько тысяч человек от разных партий, от организаций в комиссиях? Вы скажете: ну, они чуть ли не придворные. А для меня они все одинаковы. Коль они зарегистрированы, то имеют право на жизнь. Но те, о которых вы говорите, — они соответствующие заявки не подали. Они в законном порядке не представили своих людей.

Есть закон, есть Конституция... На каком основании мне их теперь туда включать? Сейчас я их, что ли, должен туда ввести? Ну, на парламентских выборах ввел в Центризбирком — и опять же меня в этом упрекали...

На основании закона — нравится вам это или не нравится — сформированы соответствующие структуры, которые и будут заниматься выборами. Вы, конечно, вправе, Ольга, задавать мне любые вопросы. Но и я вам задам вопрос. Скажите, у вас вот в связи с этим есть факты, которые свидетельствуют, что при формировании комиссий сверху донизу мы нарушили действующее законодательство? Посмотрим не с эмоциональной, как вы ставите, а с юридической точки зрения. Мы нарушили? Нет... В главном — в нарушении закона — вы нас не упрекнете.

— Какие сведения вы указали в поданной в Центризбирком декларации о своем имуществе?

— В ближайшее время эти декларации будут опубликованы в печати. Я вам гарантирую свою декларацию. И не только свою, но и всех моих домочадцев. Мне скрывать абсолютно нечего. Хотя я понимаю подтекст вашего вопроса, особенно после начала новой кампании в оппозиционных средствах массовой информации. И в связи с этим я хотел бы заявить следующее. Если вы, присутствующие журналисты, обнаружите хоть строчку, неточно указанную, — я не президент. Это самое главное, через что я не смогу переступить. И упрекнуть меня в том, что я что-то украл у своего народа, вы не сможете. Вы не сможете в этом меня упрекнуть. И вот тут я буду с вами бороться. Как только могу. Вот в этом не будет никаких компромиссов. И то, что недавно было напечатано в одной из оппозиционных газет на эту тему — да вы знаете, в какой, — так это полное вранье...

— Александр Григорьевич, сможете ли вы сказать, кто вам посоветовал арестовать Мясниковича? Что это за семь источников информации, о которых вы недавно заявляли? И еще один момент: есть ли у вас друзья среди руководства?

— Кроме того, что я сказал, большего не скажу. Я тогда сказал что сказал. Сказал откровенно. Меня потом многие упрекали, говорили, может, не надо было так откровенно. Но я считаю, надо было. Но большего я не могу сказать. Хотя, конечно, многое, очень многое мне бы хотелось сказать после выборов. Мне есть что сказать.

— Александр Григорьевич, вы насчет друзей не ответили. Может, у вас с кем-нибудь из руководства существуют дружеские отношения? С министрами, замглавами администрации?

— А почему вы ничего не говорите про главу администрации, почему про него не спрашиваете? Хотя, знаете что, Ольга, вы же сами все про моих друзей знаете. Вы сами все очень хорошо знаете...

КАКИМ ОН ПАРНЕМ БЫЛ...

Годы нахождения Александра Лукашенко у власти сформировали новую плеяду журналистов — которые ни дня не жили без войны, без партизанщины в отношении официальной информации. Хотя на самом деле когда-то Лукашенко был лучшим другом журналистов. Сегодня мы решили предоставить слово некоторым нашим коллегам, работавшим тогда с А.Г. И попросили порассуждать их на предмет того, почему лучший друг журналистов таковым уже давно не является.

Эдуард МЕЛЬНИКОВ, бывший заместитель председателя Гостелерадио, экс-главный редактор общественно-политических программ, ведущий теледебатов между Кебичем и Лукашенко в 1994 г.

— В 94-м, во время предвыборной кампании, у Лукашенко были неплохие отношения с журналистами. Ему задавали самые разные вопросы, он отвечал на них широко, всеобъемлюще. Тогда ни у кого не появлялось сомнений, и большинство журналистов устраивали его ответы. А.Г. лукавит, когда говорит, что выиграл выборы без доступа к СМИ. Если бы у сегодняшних кандидатов был такой доступ к телевидению, неизвестно еще, что бы мы получили 10 сентября. А тогда мы на телевидении завели специальный журнал по распределению эфирного времени. Лукашенко очень грамотно подошел к распределению времени, выбрал из эфирной сетки самые лакомые, самые смотрибельные куски — и пришлось их ему дать. Так что время для выступлений у Лукашенко было даже лучше, чем у Кебича.

А во время теледебатов с Кебичем Лукашенко выглядел более убедительным. Кебич же производил впечатление человека, полностью деморализованного своим оппонентом.

Первое время после победы на президентских выборах Лукашенко продолжал общаться с журналистами. Я помню, на телевидении проводились прямые линии с его участием. Он был разговорчив, как-то нам пришлось даже выделять дополнительное эфирное время.

С телевидения я ушел в июле 95-го, когда понял, что из себя представляет майский референдум, и когда стало невозможно работать. Мы создали студию "Политика", и регулярно нарывались на упреки начальства, хотя Григорий Кисель нас на первом этапе защищал. Но потом он не смог нас защищать, а мы не смогли ставить в эфир то, что считали нужным. И нам пришлось уволиться...

— Из-за чего, на ваш взгляд, возникла нынешняя ситуация?

— Это часть той эволюции, которая произошла с обществом и вертикалью власти. Белорусское телевидение стало частью этой вертикали.

Что касается приглашения журналистов негосударственных СМИ на встречу с президентом, то этот шаг правильный. Зачем общаться только с одной частью журналистов? Надо уметь отвечать на неудобные вопросы — это было бы неплохо для всех кандидатов в президенты. Мне кажется, было бы правильным общение всех кандидатов на высший государственный пост с журналистами.

Жанна ЛИТВИНА, в 1994 г. — главный редактор радиостанции "Белорусская молодежная", сейчас — руководитель Белорусской ассоциации журналистов.

"Белорусская молодежная" тогда была чуть ли не единственным СМИ, работавшим в режиме прямого эфира. Лукашенко был удобен, потому как был говорлив, у него имелись свои суждения, зачастую носившие радикальный характер. Он был хорошим собеседником для прямых эфиров.

Кстати, вспоминая последний месяц перед прошлыми президентскими выборами, хочется отметить, что тогда кандидаты в президенты были в других условиях. У них было по четыре выступления по телевидению, кандидаты сами определяли участников прямой телепрограммы, наиболее интересные им темы для разговоров. В телевизионном президентском марафоне самая первая программа была тогда у Лукашенко. В студии находился сам Лукашенко и Александр Федута. Федуту посадили в профиль, Лукашенко осветительные приборы слепили глаза — т.е. чисто телевизионными методами было сделано все, чтобы он не выглядел Аленом Делоном. Хотя он все равно производил сильное впечатление, и каждое его слово, видимо, проливалось бальзамом на душу электората. Он знал, что от него хотят услышать.

— А как он тогда реагировал на критику?

— Он не обращал внимания на критические замечания. Но прекрасно осознавал, что ему нужна пресса, он дорожил хорошими отношениями с журналистами. Тогда только появились первые негосударственные газеты, возникла новая генерация белорусской прессы — и он дорожил отношением этой прессы к себе. Может, он даже кое-что ей прощал, понимая, что эта пресса может многое для него сделать.

На одной из своих первых пресс-конференций он сказал журналистам фразу, сразу же ставшую крылатой: "Вы свободны". Но прошло буквально несколько месяцев, и на встрече с силовиками он заявил, что они должны вмешиваться в работу СМИ. Это повергло в шок. А потом появились белые пятна в газетах на месте антикоррупционного доклада Антончика. И тогда стало ясно, что противостояния не избежать. Эти пятна, наверное, можно рассматривать как точку отсчета того времени, когда и Лукашенко, и вся исполнительная власть стали очень последовательны в своем отношении к прессе. Сегодня ведь государственные СМИ превращены в идеологическую машину, работающую в заданном направлении. Происходит навязывание идеологии — единственной и обязательной для всей страны. И этой идеологической машине противостоят немногочисленные негосударственные СМИ.

— На этой неделе представителей негосударственных СМИ впервые пригласили к Лукашенко. Может, это означает начало "потепления" отношений?

— Мне казалось, что вы не должны были идти туда, потому что весь предыдущий опыт такого рода встреч, по сути, провален для всех, за исключением Лукашенко. Приглашенные не успевали высказать свое мнение, отстоять свою точку зрения. Все публичные выступления Лукашенко перед своим активом, перед "вертикалью", перед общественностью сводились к тому, что он захватывал инициативу, навязывал тему разговора, и переломить ситуацию не получалось. После видеоряда последних встреч, когда министры что-то писали, не поднимая головы, боясь встретиться с Лукашенко взглядом, встреча с журналистами негосударственных СМИ по-своему знаменательна. Журналисты смогли с ним говорить на равных, вы смогли говорить нелицеприятные вещи. Это хороший пример для тех людей в этой стране, у которых осталось чувство собственного достоинства.

Но никакого потепления отношений, на мой взгляд, не произошло. Это был политический трюк. В предвыборный период нужно демонстрировать лояльность ко всем людям, которые завтра будут избирателями, — даже если они не разделяют его политических убеждений. Это была разовая уловка. Не нужно обольщаться — разделение на своих и врагов очень жесткое.

ПУЛЬС

Зноў апаганілі Курапаты

Невядомыя вандалы ноччу апаганілі мемарыяльны комплекс ва ўрочышчы Курапаты, прысвечаны памяці ахвяраў рэпрэсій 1937-1941 гадоў.

Разбіта мемарыяльная дошка на ўваходзе ў прысады комплексу, а таксама разбураны невялікі помнік, падараваны амерыканскім народам беларускаму, у прыватнасці, поўнасцю разбіта гранітная пліта з дароўным надпісам "Ад народа ЗША беларускаму народу для памяці".

Гэта ўжо не першы выпадак апаганьвання мемарыяльнага комплексу. У ноч на 22 ліпеня 2001 года вандалы сарвалі пліту з дароўным надпісам, але сам помнік ацалеў. Зараз жа ён наўрад ці падлягае аднаўленню.

Генадзь БАРБАРЫЧ.

Кінафестываль "Адзіны свет"

13 жніўня ў Беларусі пачаўся прагляд дакументальных фільмаў — лаўрэатаў чэшскага фестывалю "Адзіны свет".

Арганізатарамі акцыі, якая праводзіцца ў Мінску і 80 гарадах Беларусі ў рамках мабілізацыйнай кампаніі "Выбірай", выступілі МКЦ і чэшскі фонд "Чалавек у бядзе". Чэшскі бок прадставіў для прагляду 12 фільмаў, створаных дакументалістамі Вялікабрытаніі, Даніі, Беларусі, Нідэрландаў, ЗША, Чэхіі і Эстоніі. Сярод іх — вядомыя карціны беларускіх рэжысёраў "Звычайны прэзідэнт" Юрыя Хашчавацкага і "Страх" Леаніда Міндліна і Уладзіміра Андронава.

Ва ўсіх гарадах акцыя праводзіцца ў офісах грамадскіх арганізацый і толькі ў Віцебску ўдалося арганізаваць яе ў зале гарадскога кінатэатра. Спроба ж дэмакратычнай грамадскасці правесці кінапрагляд у Гомельскай вобласці завяршылася тым, што міліцыя канфіскавала фільмы і праграмы фестывалю ў яго арганізатараў.

Марат ГАРАВЫ.

Ахвярамі тэрактаў у Ізраілі становяцца выхадцы з былога СССР

Ахвярамі тэрактаў на тэрыторыі Ізраіля становяцца, сярод іншых, і выхадцы з былога СССР.

Пра гэта заявіла Эці-Кацір-Касласі, часовая паверaная ў справах Ізраіля ў Беларусі, на прэс-канферэнцыі, якая прайшла ў пасольстве Дзяржавы Ізраіль.

Паводле яе слоў, пасольству дакладна вядома толькі пра тое, што пры выбуху, арганізаваным на дыскатэцы ў Тэль-Авіве 3 чэрвеня 2001 года, сярод 20 загінуўшых была і дзяўчына, якая нарадзілася ў Беларусі.

Па словах дыпламата, у сярэднім у Ізраілі адбываецца 22 тэрарыстычныя акты штодзень, прычым экстрэмісты наносяць удары па ўсёй тэрыторыі краіны. Імі выкарыстоўваюцца ўсе наяўныя сродкі — ад камянёў да артылерыйскіх гармат і ракет. Такім чынам, нягледзячы на ўсе прымаемыя меры, нельга выключыць, што ахвярамі тэрактаў могуць стаць (ці ўжо сталі) іншыя выхадцы з Беларусі. Тым не менш дыпламат не прагназуе адтоку з краіны ўчарашніх эмігрантаў: "Усе, хто прыязджаў у нашу краіну, ведалі аб палітычнай сітуацыі ў Ізраілі і той напружанасці, якая існуе на Блізкім Усходзе. Нягледзячы на сённяшнія праблемы, узровень жыцця ў Ізраілі застаецца адным з самых высокіх у свеце. Настрой людзей застаецца цудоўным, сонца па-ранейшаму свеціць ярка, нягледзячы ні на што".

Юрый ШЫРОКІ.

Гомельская міліцыя адшуквае рускага спаніеля

Гомельская міліцыя адшуквае 4-месячнага сабаку пароды "рускі спаніель". Сабака можа дапамагчы выявіць аўтамабіль "Аўдзі-100", які невядомыя выкралі разам з жывёлінай.

Гамяльчанін вярнуўся дадому пасля ўік-энда на прыродзе і заехаў ва універсам "Сельмашаўскі" па прадукты харчавання. У гэты час аўтамабіль і выкралі. Як паведаміў уладальнік, акрамя сабакі ў салоне аўтамашыны быў гладкаствольны чатырохзарадны паляўнічы карабін 12 калібру, 40 патронаў да яго, італьянскі газавы пісталет маркі "Поліс" 8 калібру, два сотавыя тэлефоны, чатырохмесная палатка, спальны мяшок, дакументы на іншамарку і на ружжо.

Чатыры смерці ў нядзелю

Мінулыя выхадныя — 11 і 12 жніўня — адзначаны ў Гомельскай вобласці серыяй няшчасных выпадкаў.

Напрыклад, у Веткаўскім раёне ля вёскі Хальч сарваўся з моста (падчас яго рамонту) 50-гадовы рабочы гомельскага мостабудаўнічага ўпраўлення. Мужчына загінуў.

У Рэчыцы 48-гадовы мужчына вяртаўся дадому ў стане моцнага алкагольнага ап'янення. Падымаючыся па лесвіцы ў пад'ездзе, ён спатыкнуўся і ўпаў на пляцоўку. У момант падзення мужчына стукнуўся галавой аб батарэю цэнтральнага ацяплення. Траўма аказалася смяротнай.

На адной з цэнтральных вуліц Жлобіна прахожыя знайшлі мёртвага мужчыну. Зверху на целе ляжалі веласіпед "Аист" і абарваны провад электраперадач. Відаць, прычынай гібелі 32-гадовага мужчыны стала паражэнне электратокам.

У вёсцы Падшчыстае Буда-Кашалёўскага раёна 21-гадовы малады чалавек спрабаваў збіць яблыкі з дрэва ствалом паляўнічага ружжа 16 калібра. Ружжо было незарэгістраваным, але заражаным. У выніку адбыўся міжвольны выстрал. Куля трапіла маладому чалавеку ў грудзі і ён памёр.

Ірына ШАНЦАВА.

Сеюць опіум

3,5 тоны маку-сырцу выявіла і знішчыла ў Шчучынскім раёне аператыўная група Упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці сумесна з Упраўленнем нораваў і барацьбы з незаконным абаротам наркотыкаў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Незаконныя пасевы маслічнага і опіумнага маку былі выяўлены ў гаспадарках жыхароў вёсак Прудзяны, Громкі, Глушні. Да адміністрацыйнай адказнасці за высяванне маку былі прыцягнутыя 14 жыхароў гэтых вёсак. У дачыненні да жыхаркі вёскі Громкі, на прысядзібным участку якой было выяўлена і канфіскавана 120 кілаграмаў галовак маку, узбуджана крымінальная справа.

Паводле папярэдніх даных следства, ініцыятарамі пасеваў і заказчыкамі наркасыравіны з'яўляюцца лідэры злачынных груповак Літвы і прадстаўнікі цыганскай дыяспары Гродзенскага рэгіёна.

Павел МАЖЭЙКА.

ДАЙДЖЕСТ

Украинского депутата обвинили в устранении коллег

Михаил Потебенько

Заказчиком убийств народных депутатов Украины Евгения Щербаня и Вадима Гетьмана оказался народный депутат украинского парламента нынешнего созыва. Об этом заявил в понедельник на пресс-конференции в Киеве генпрокурор Украины Михаил Потебенько. По его словам, к 1 сентября генпрокуратура внесет в Верховный Совет Украины представление на согласие парламента о привлечении этого депутата к уголовной ответственности. Фамилию депутата генпрокурор журналистам не назвал. Михаил Потебенько отметил, что парламент будет ознакомлен со всеми деталями расследования убийств.

Напомним, что народный депутат Украины Евгений Щербань и его супруга были расстреляны неизвестными в упор из автомата в аэропорту Донецка во время выхода из самолета в марте 1996 года. А народный депутат Украины, президент биржевого комитета Украинской межбанковской валютной биржи, бывший председатель правления Национального банка Украины Вадим Гетьман был убит в апреле 1998 года в лифте своего дома.

РИА "Новости".

В Перу осужденные за терроризм захватили свои тюрьмы

Заключенные двух перуанских тюрем, осужденные за терроризм, взбунтовались и захватили часть тюремных помещений. Акты неповиновения произошли в тюрьмах Мигель Кастро в восточной части Лимы и Эль Милагро в городе Трухильо, расположенном в 570-и километрах к северу от перуанской столицы.

Заключенные обеих тюрем забрались на крыши зданий, жгут костры и размахивают плакатами с лозунгами "отменить пожизненное заключение" и "мы требуем пересмотра дел в гражданских судах". Полиция стреляет в воздух и использует слезоточивый газ внутри помещений. При этом власти не располагают сведениями о том, удалось ли бунтовщикам захватить заложников.

"Франс-Пресс".

"Грабитель века" попал в больницу

Величайшему грабителю поездов 20 столетия Ронни Биггз было сделано экстренное переливание крови, после того как его доставили в больницу. Отпраздновавший в среду свое 72-летие Ронни Биггз сейчас находится в госпитале "Королева Елизавета" в Гринвиче, куда его срочной ночью доставили из тюрьмы "Белмарш".

26-летний сын Биггза Майкл боится, что его отец страдает от внутреннего кровотечения. Однако пока точный диагноз не известен, сообщает пресс-секретарь семьи.

Напомним, что Ронни Биггз стал известен после того, как принял участие в самом крупном в истории Великобритании ограблении поезда. Биггз в течение 35 лет, сначала в Австралии, а затем в Бразилии, скрывался от правосудия. И лишь в этом году добровольно сдался Скотланд-Ярду.

Ananova.com.

Фоссетт снизил скорость и прочел электронное письмо

Американский путешественник Стив Фоссетт снизил скорость полета своего шара с 90 до 53 километров в час. Причиной этому стала плохая погода у побережья Чили. Фоссетт также снизил высоту полета с 5,8 до 1,8 километра. "На этой высоте шар может оказаться, и у Стива есть возможность снять кислородную маску и регулировать содержание кислорода в необходимых пределах", — сообщил менеджер полета Тим Коул. В настоящее время Фоссетт пролетел 40 процентов своего пути. Он надеется попасть в книгу рекордов как первый человек, совершивший кругосветное путешествие на воздушном шаре.

США намерены пересмотреть вопрос о санкциях против Индии

США в скором времени могут снять или смягчить санкции против Индии, наложенные после проведения ядерных испытаний в 1998 году. Об этом в интервью газете The Washington Post заявил заместитель госсекретаря США Ричард Эрмитэдж. Мы займемся этой проблемой в следующем месяце, когда Конгресс вернется с летних каникул. Пока неизвестно, будут ли также сняты и подобные санкции с Пакистана, наложенные на страну после того, как она провела свои ядерные испытания.

"Би-Би-Си".

В Канаде запретят продажу "мягких" и "легких" сигарет

Министр здравоохранения Канады Аллан Рок объявил, что намерен ввести запрет на продажу сигарет с названиями "мягкие" и "легкие". По словам министра, подобные наименования вызывают у потребителя ложное чувство безопасности, на самом же деле такие сигареты не менее вредны для здоровья. Кроме того, по статистике, среди потребителей легких и мягких сигарет практически нет случаев полного отказа от курения.

